УДК 930:37(4-15)(091)



**В.А. ПІЛЕЦКІ**, доктар гіст. навук,
галоўны навуковы супрацоўнік
Цэнтра гісторыі навукі і архіўнай справы
ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі»,
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

*Статья поступила 15 октября 2024 г.*

# ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД ПРАБЛЕМЫ: ЗМЕСТ АДУКАЦЫІ ДЫ ВЫХАВАННЯ ПАДЧАС ПЕРАХОДУ АД АНТЫЧНАСЦІ ДА СЯРЭДНЯВЕЧЧА[1]

*На аснове прац айчынных і замежных даследчыкаў праведзены кароткі гістарыяграфічны агляд праблемы: змест адукацыі ды выхавання ад антычнасці да Сярэднявечча. Паказана палітра поглядаў розных гісторыкаў (апошніх стагоддзяў) па пытаннях змены зместу адукацыйна-выхаваўчага працэсу падчас пераходу заходнееўрапейскага грамадства ад антычнасці да Сярэднявечча. Ставілася задача высветліць: што пісалі?; як успрымалі вышэйадзначаныя змены?; на якіх аспектах (адносна кантэнту навучання) засяроджвалі сваю ўвагу даследчыкі?. Што засталося недаследаваным менавіта з пункту гледжання зместу (кантэнту) навучання і выхавання? Не апошняй задачай, з'яўлялася (па-магчымасці) паказаць погляды гісторыкаў розных краін на адну і тую ж праблему. Выявіць супадзенне іх меркаванняў. Адрозненне ці пярэчанне сфармуляваным высновам. Цікавіла, канешне, і база крыніц, абгрунтаванасць поглядаў, ды іншыя розныя аспекты.*

**Ключавыя словы**: *гістарыяграфія, Сярэднявечча, змест выхавання, антычнасць, адукацыя, царква, хрысціянства.*

**PILETSKY V.A.,** Doctor of Hist. Sc.,
Chief Researcher at the Center for the History of Science and Archival Affairs
Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk

## HISTORICAL OVERVIEW OF THE PROBLEM: THE CONTENT OF EDUCATION AND UPBRINGING DURING THE TRANSITION FROM ANTIQUITY TO THE MIDDLE AGES

*Based on the works of domestic and foreign researchers, a brief historiographical review of the problem: the content of education and upbringing from Antiquity to the Middle Ages was conducted. The palette of views of different historians (of recent centuries) on the issue of changing the content of the educational process during the transition of Western European society from antiquity to the Middle Ages is shown. The task was to find out: what was written?; how were the above changes perceived?; on which aspects (regarding the content of training) did the researchers focus their attention?. What remains unexplored precisely from the point of view of the content (content) of education and upbringing? Not the last task was to show (if possible) the views of historians of different countries on the same problem. Find out the coincidence of their opinions. Distinction or objection to the formulated conclusion. I was interested, of course, in the base of sources, the validity of views, and other various aspects.*

[1] Статья публикуется в авторской редакции.

***Keywords***: *historiography, the Middle Ages, the content of education, antiquity, education, church, Christianity.*

Эвалюцыя зместу (кантэнту) адукацыі ды выхавання на розных этапах гісторыі чалавецтва цікавая тым, што яна наўпрост дэманструе ўзровень развіцця грамадства. Дастаткова прааналізаваць тыя кампетэнцыі што прывіваліся падрастаючаму пакаленню ў той ці іншы гістарычны час (у тым ці іншым рэгіёне, краіне, цывілізацыі), а таксама іх ідэалагічны антураж, і палітычныя сілы якія апекаваліся гэтым працэсам, то можна адразу рабіць даволі глыбокія высновы аб узроўні развіцця, спецыфіцы эканомікі, культуры і палітыкі ў гэтым грамадстве.

Пераход заходнееўрапейскага абшару ад антычнасці да Сярэднявечча суправаджаўся карэннай трансфармацыяй розных сфер жыццядзейнасці, але найперш выхаваўча-адукацыйнай галіны. У аснове змен распачатых крызісам і ліквідацыяй Рымскай імперыі, ляжалі рэлігійна-ідэалагічныя фактары. Якія, урэшце, праз уздзеянне на школьную справу, фактычна змянілі аблічча ўсяго грамадства. І кожнага асобнага чалавека (у культурных, адукацыйных і псіхалагічных адносінах) у прыватнасці.

Разам з тым, формы выхавання і адукацыі падрастаючых пакаленняў, першапачаткова не змяніліся. Паўсюдна вывучаліся тыя ж “сем вольных мастацтваў”. Якія дарэчы, засталіся ва ўжытку, у якасці своеасаблівага шаблону, і падчас эпохі Сярэднявечча. Як жа здарылася, што “сем вольных мастацтваў” вывучалі і ў антычнасці і ў Сярэднявеччы, а вынік адносна выхавання канкрэтнага чалавека аказаўся зусім адрозны? Адказ просты: карэннай трансфармацыі падвергся найперш змест (кантэнт) навучання і выхавання. Набор кампетэнцый (сутнасць адукаванасці), аб чым мы ўжо аднойчы гаварылі, у Сярэднявеччы аказаўся дыяметральна іншым у параўнанні з антычнасцю [1]. І меў, безумоўна, іншае мэтавае прызначэнне.

Задача дадзенага даследавання пазнаёміцца з палітрай поглядаў вучоных (апошніх двух-трох стагоддзяў) на праблему змены зместу выхаваўча-адукацыйнага працэсу падчас пераходу ад антычнасці да Сярэднявечча. Высветліць: што пісалі пра гэта гісторыкі; як успрымалі вышэйадзначаныя змены; на якіх аспектах (адносна кантэнту навучання) засяроджвалі сваю ўвагу? Што засталося недаследаваным менавіта з пункту гледжання зместу (кантэнту) навучання і выхавання? Не апошняй задачай з’яўлялася і тое, каб па-магчымасці паказаць погляды гісторыкаў розных краін на адну і тую ж праблему. Выявіць супадзенне іх поглядаў незалежна ад краіны пражывання. Адрозненне ці пярэчанне. Цікавіла, канешне, і база крыніц, абгрунтаванасць сфармуляваных высноў, ды многае інш.

Непасрэдна змест (кантэнт) адукацыі ды выхавання пры пераходзе ад антычнасці да Сярэднявечча, у параўнаўчым (грамадазнаўчым) кантэксце, яшчэ не быў прадметам асобнага гістарыяграфічнага даследавання. Звесткі пра яго, як правіла, прысутнічаюць у выданнях па гісторыі школы, выхавання ды адукацыі. Сегменты тэмы паасобку знайшлі адлюстраванне на старонках шматлікіх даследаванняў у айчыннай і замежнай літаратуры.

Праблемы зместу і адпаведных выхаваўча-адукацыйных кампетэнцый найперш, канешне, разглядаюцца ў педагагічнай літаратуры. Ёсць даследаванні якія прысвечаны зместу адукацыі ў якасці навукова-тэарэтычнай праблемы [2], альбо тэорыі адукацыйнага працэсу [3], а таксама працы вучэбна-практычнага характару [4]. Ды іншыя, дзе так ці інакш разглядаецца змест адукацыі на асобных этапах гісторыі чалавецтва. Але педагогі, як правіла, не робяць высноў аб яго сувязі з сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным развіццём грамадства.

Гістарычныя даследаванні таксама, у той ці іншай ступені, закранаюць названую праблематыку. Сярод іх, найперш, маюцца працы якія ахопліваюць перыяд антычнасці, ці Сярэднявечча, альбо асобныя іх стадыі цалкам, з пункту гледжання дзейнасці школ, справы навучання і адукацыі дзяцей. І, безумоўна, у іх тэксце, асобны сегмент даследавання прысвечаны праблеме зместу адукацыі і выхавання ў той час.

Так, напрыклад, у кнізе польскага гісторыка Станіслава Літака даволі канкрэтна і выразна паказаны ідэальны варыянт зместу выхавання Гамераўскай Грэцыі (XI–IX стст.

да н.э.). Які сфарміраваўся на падставе (альбо, пад уплывам) тэкстаў гамераўскіх твораў: "Іліяда" і "Адысея". Іх звычайна, грэкі завучвалі на памяць. І ўжо нават тым самым, фарміравалі ў сваёй свядомасці неабходныя выхаваўчыя якасці. Якія складаліся з наступных правіл: "*...чалавек павінен імкнуцца да дасканаласці! Ідэал сапраўднага грэка быў прадстаўлены Гамерам у асобе Ахіла. Гэта павінен быў быць чалавек, які валодае моцным фізічным целаскладам, атлетызмам, маральнасцю і прыгажосцю. Ён павінен быць смелым і адважным, ідэальным мужчынам які спалучае ў сабе элегантнасць з мужнасцю на полі бою, .... Арэта (ст.-грэц.: Ἀρετή), г. зн.: "доблесць", "мужнасць" (у старажытна грэцкай філасофіі – багіня мужнасці, дачка Праксідыкі... – В.П.), былі агульным ідэалам грэцкага выхавання (пайдэі), першапачаткова даступным толькі прадстаўнікам арыстакратыі. Пазней, па меры развіцця грамадскіх адносін ды эвалюцыі філасофскіх і рэлігійных поглядаў (найперш хрысціянства), яны пашырылі сваё значэнне і сталі агульнаграмадскім ідэалам.*

*Яшчэ адной рысай грэцкай пайдэі быў ідэал чалавека, які характарызуецца вышэйшай фізічнай і духоўнай дасканаласцю. Прыгажосць цела павінна ісці поруч з прыгажосцю духу... (гэта значыць – В.П.) ... адпавядаць служэнню Багам. Рэлігія, была цесна звязана з музычнай адукацыяй і ўменнем іграць на інструменце, паэзіяй, рэлігійнымі спевамі і танцамі, а таксама: веданнем пісьма; літаратуры; тэатра; і дасведчанасцю ў грамадскіх справах.*

*Гэтае разумнае і пастаяннае імкненне да лепшага (рыса, першапачаткова звязаная з арыстакратыяй) называлася "калакагатыя" (прыгажосць і дабро). У вольным перакладзе гэта азначала тое ж самае, што і англійскі тэрмін «джэнтльменства» (у сэнсе: карэктнасць, выхаванасць, высакароднасць – В.П.). Вышэйназваныя асаблівасці, прысутныя ў адукацыйным працэсе і да сённяшніх дзён, мелі месца ў розных грэчаскіх полісах у рознай ступені. Прычым, у адных краінах падкрэслівалася значэнне фізічнага выхавання (напрыклад у Спарце – В.П.), а ў іншых больш увагі надавалася разумоваму выхаванню.*" [5, s.22].

Цалкам замежныя гістарычныя даследаванні дзе прадстаўлена гісторыя выхаваўча-адукацыйнага працэсу на пераломе эпох з'явіліся даволі даўно. Так, напрыклад, французскія даследчыкі першай паловы XIX ст., даволі глыбока закранулі названую праблематыку, аб чым мы ўжо выказалі нашы меркаванні асобнай публікацыяй [6].

Адной з першых прац, дзе ахарактарызаваны менавіта пераломны этап, і высветлены найбольш важныя асаблівасці змен у змесце выхавання і адукацыі пры пераходзе ад антычнасці да Сярэднявечча, была чатырохтомная праца класіка французскай гістарыяграфіі Франсуа Гізо (гг.ж.: 1787–1874): "*Гісторыя цывілізацыі ў Францыі*". А яго меркаванні наконт заяўленай намі тэмы трапілі на старонкі другога тома [7]. Дзе аўтар вельмі выразна намаляваў карціну пераходу, ад важнасці навукова-рацыянальнага зместу пры падрыхтоўцы падрастаючых пакаленняў у эпоху антычнасці, да карэннага ўсталявання ўсёй справы выхавання на рэлігійна-ідэалагічных рэйках у эпоху Сярэднявечча. Было заўважана, што выхаванне і адукацыя падвергліся ўнутранай, менавіта зместавай трансфармацыі. Пры якой знешне, на першы погляд, усё заставалася як і раней. Навучэнцы епіскапскіх школ напрыклад засвойвалі навучальныя прадметы тых жа "сямі вольных мастацтваў" (граматыка, рыторыка, дыялектыка (логіка), арыфметыка, геаметрыя, музыка і астраномія). Але цяпер, усе гэтыя навукі: "*...не столькі навучалі, сколькі прывязвалі да Багаслоўя. Апошняе было фундаментам (любой – В.П.) адукацыі: усё абапіралася на каментаванне рэлігійнай літаратуры, каментаванне гістарычнае, філасофскае, алегарычнае, маральнае. Адзінай мэтай (любой адукацыі – В.П.)... была падрыхтоўка царкоўнаслужыцеляў; любыя заняткі, па любых навучальных прадметах былі накіраваны на дасягненне гэтага (адзінага) выніку*" [7, p.4-5].

Цікавае даследаванне было прадстаўлена ў 1849 г., ад'юнктам-прафесара Нацыянальнай школы хартый (École nationale des chartes) Валет дэ Вірывілем: "*Народная адукацыя ў Еўропе і галоўным чынам у Францыі ад часоў хрысціянства да нашых дзён...*" [8], выкананае ў рамках буйнага праекта "*Сярэднія вякі і Адраджэнне*" пад кіраўніцтвам Фердынанда Сэрэ. Тут, у першай главе багата ілюстраванага выдання, зроблены заўвагі наконт зместу навучання ў

"*гала-грэчаскіх*" і "*гала-рымскіх*" навучальных установах IV ст. А таксама, ва ўзнёслых (хвалебных) фарбах, абазначаны прыход хрысціянскай эры ў выхаванне падрастаючых пакаленняў: "*…пакуль сафісты і рытары змагаліся з прыдзіркамі, скарачэннямі і граматычнымі каментарамі, ўсе гэтыя бяздольныя людзі (хрысціяне – В.П.) станавіліся ўладальнікамі вышэйшага дабра (звярталі свае погляды на Збаўцу і змест яго Святога Евангелля)…*" [8, p.69]. Больш дакладна аўтар спыніўся на змесце навучання ў манастырскіх школах і прыходскіх установах VI–VII стст., дзе было характэрна: "*…вывучэнне літар, а таксама прыалтарнае служэнне…*" [8, p.72]. І паказаў станаўленне кіраўніцкай структуры епіскапскіх (кафедральных), у франкамоўным выражэнні: "капітулярных", альбо "камунальных" (*фр*.: les écoles chapitrales), школ горада ў асобе спецыяльнага чыноўніка "шкалатара" (*фр*.: écolâtre). Была абазначана палітра дысцыплін што выкладаліся ў названых установах: "*…граматыка, дыялектыка, рыторыка, геаметрыя, астралогія, арыфметыка, спевы і Святое Пісанне (тэалогія)*" [8, p.72]. Важнай заўвагай аўтара можна лічыць і тое, што ён падкрэсліў інфармацыю пра аўтарства падручнікаў па якіх навучэнцы епіскапскіх школ засвойвалі матэрыял гуманітарных прадметаў. Іх аўтарам: "*…быў… граматык … Міней-Марцыян-Фелікс Капэла…*" [8, p.72]. Стваральнік шырока вядомага ў Сярэднявеччы, 9-ці томнага твора "*Аб шлюбе Філалогіі і Меркурыя*". Які, нягледзячы на міфалагічную падаплёку пачатковага сюжэта, фактычна, уяўляў сабой, камплект падручнікаў па ўсіх дысцыплінах т.зв.: "сямі вольных мастацтваў", і ўключаў увесь аб'ём ведаў што вывучаліся школьнікамі еўрапейскіх краін на працягу эпохі Сярэднявечча.

У пачатку другой паловы XIX ст. (1853 г.) выйшла манаграфія выкананая пад патранажам каралеўскай Акадэміі Бельгіі (у Бруселі): "*Ад дзяржаўнай адукацыі да Сярэднявечча (з VIII - да XVI ст.)…*" [9]. Гэта калектыўная праца двух гісторыкаў Шарля Сталаерта і Піліпа ван дер Хегена. Якія, на тытульнай старонцы кнігі, абазначылі мэту свайго даследавання дзе закранаецца і вызначаная намі тэматыка ў тым ліку: "*Якім быў стан школ… ?*"; "*Якія прадметы там выкладалі, методыкі якім там следавалі… ?*". Тэкст кнігі падзелены на дзве паловы: "*Гістарычная частка*" і "*Дыдактычная частка*". У пачатку сваёй працы аўтары, як прыхільнікі хрысціянскага вобразу мыслення, даволі прыязна абазначылі прыход хрысціянства: "*…апосталам Хрыста, …, было даручана заснаваць на нашай Радзіме новую …цывілізацыю, распаўсюджваючы пладародныя парасткі мастацтва і навукі… (пачынаючы з VII ст.)…*". "*…у бліжэйшы час, у кожным манастыры з'явілася свая школа адкуль цывілізацыя і навука распаўсюдзіліся па краіне…*" [9, p. 8]. Што да зместу адукацыі ды выхавання ў манастырскіх школах ("*…адкуль цывілізацыя і навука распаўсюдзіліся па краіне…*"), то аўтары выказаліся даволі павярхоўна і мудрагеліста: "*…першае літаратурнае вучэнне, што зыходзіла з манастыроў, адрознівалася прастатой, якая рэдка перавышала патрэбы апостальскай місіі альбо манаскага стану. Да таго ж не мела агульнага і аднастайнага накірунку… (яно было – В.П.) …аддадзена на водкуп густу і характару абата… . (І таму гэтыя заняткі былі – В.П.) …вельмі недасканалыя і разнастайныя ў розных месцах…*" [9, p. 8]. А потым аўтары, якія раней гаварылі пра "*…распаўсюджванне пладародных парасткаў мастацтва і навукі…*" вызванага прыходам рэлігіі ў сферу выхавання і адукацыі, вымушаны былі прызнаць, што "*…па ўсёй Еўропе з V-га., да сярэдзіны VIII ст., адукаванасць грамадства прыйшла ў занядпад…, невуцтва і варварства сталі празмернымі…*". І спасылаліся на цытату з працы Франсуа Гізо (пра якую мы ўжо казалі), дзе адзначана, што: *..каля 768 года мы ўжо не бачым ніякіх слядоў навук і прыгожых мастацтваў..., акрамя духоўных асоб і манахаў…, якія ледзь-ледзь умелі чытаць і пісаць, але былі невукамі ва ўсім астатнім…*" [9, p. 8].

Важныя заўвагі, зробленыя ў аналізуемай манаграфіі адносна рэлігійнага выхавання перыяду кіравання Карла Вялікага (768–814). Тут прыведзена мноства спасылак на законы ("*капітулярыі*") франкскіх каралёў, у тым ліку датычна адукацыйна-выхаваўчага працэсу. У дачыненні да зместу адукацыі заўважана, што Карл Вялікі "*…даволі моцна апекаваўся праблемай навучання духавенства…*", а разам з ім ён не забываў і аб выхаванні простага насельніцтва, "*…але абме-*

*жаваў яго толькі маральна-рэлігійным навучаннем…*”. Прычым рэлігійная дактрына, часцей за ўсё, навязвалася насельніцтву супраць яго волі і жаданняў. І даволі жорсткімі метадамі. Так, напрыклад, “*…па ўмовах капітулярыя 804 г., свецкія жыхары, якія не валодалі асновамі апостальскага веравучэння і тэкстам нядзельнай малітвы, павінны былі пасціцца ўжываючы толькі ваду…*”. Капітулярый прадпісваў: “*… падвяргаць іх бічаванням (ды іншым фізічным пакараннем – В.П.) да той пары, пакуль яны не вывучаць неабходныя малітвы. А для тых хто будзе настойваць на сваім невуцтве, было ўстаноўлена яшчэ адно правіла. Дзяржаўныя ўлады павінны былі абнародаваць іх прозвішчы паімённа…*” [9, p. 16].

Цалкам, у першай (“*гістарычнай*”) частцы кнігі, зроблена значная колькасць заўваг наконт зместу адукацыі на тых ці іншых этапах і ў розных відах выхаваўчых устаноў. Цікавымі матэрыяламі насычана і “*дыдактычная*” частка кнігі хоць яна і мае адносна сумбурную (безсістэмую) будову. Так напрыклад (на стар. 404–405) аўтары прыводзяць дадзеныя з капітулярыя прынятага *“…на Саборы ў Ахен-ла-Шапель у 802 г. (фр.: au Concile d'Aix-la-Chapelle* [10]), аб змесце выхавання і адукацыі святароў. Дзе ўсе прадметы падрыхтоўкі былі аб'яднаны ў адзіную “*…афіцыйную праграму, якая ўключала ў сябе наступныя прадметы: 1. Сімвал веры святога Афанасія і ўсё, што тычыцца веры каталіцкай; 2. Апостальскі сімвал веры; 3. Нядзельная малітва з тлумачэннямі; 4. Увесь Псалтыр; 5. Рытуал хрышчэння; 6. Дабраславеньне душы; 7. Экзарцызм; 8. Пакаянне; 9. Сакрамэнтарый; 10. Лічэнне; 11. Рымскае песнапенне (альбо: “Грыгарыанскае песнапенне” – тэксты Св. Пісання ў яго лацінскай версіі – В.П.”); 12. Евангелле або чытанні з кнігі Быцця, з тлумачэннем; 13. Словы святых Айцоў, для пропавадзі; 14. Святое Пісанне з тлумачэннямі; 15. Пастырская кніга і кніга абавязкаў; 16. Пастырскі ліст Геласія* [11]; *17. Напісанне дакументаў і лістоў* [9, p.104]. І падкрэсліваюць, што пастановы гэтага Сабору ўяўляюць сабой вельмі важную гістарычную крыніцу. Яны, па меркаванні аўтараў, фактычна вызначаюць змест “*духоўнага навучання*” цалкам для ўсяго ранняга Сярэднявечча. Таму што ўсе капітуляры, і пазнейшыя варыянты пераліку неабходных дысцыплін для навучання святароў, абапіраюцца на палажэнні менавіта гэтага Сабору. Які адбыўся ў сталічным горадзе Імперыі Карла Вялікага (Ахене).

Далей, аўтары яшчэ больш удакладняюць змест адукацыі святароў. Яны падкрэсліваюць, што калі выдаліць царкоўныя дысцыпліны з вышэй пералічанай праграмы, то застануцца толькі наступныя навукова-рацыянальныя: “*1. Граматыка; 2. Рыторыка; 3. Тэхніка лічэння, як мастацтва для прызначэння Вялікадня, ды іншых рухомых святаў якімі абмяжоўваецца ўся звычайная арыфметыка тых часоў; 4. Музыка, а менавіта: ноты для рымскага песнапення; 5. Мастацтва пісьма; 6. Багаслоўе, якоя ўключала Святое Пісанне і працы святых Айцоў, вывучэнне і тлумачэнне якіх прыявяло да пэўнай дыялектыкі і ўяўленняў пра логіку. Яны па ранейшаму ўтрымлівалі даследаванні па геаграфіі, гісторыі і іншых чалавечых ведах, якія тады яшчэ не дасягнулі статуса асобных прыродазнаўчых навук…*” [9, p.105]. Такім чынам у кнізе, дадзены канчатковы варыянт аўтарскага бачання зместу (кантэнту) выхаваўча-адукацыйнага працэсу пры падрыхтоўцы святароў у перыяд Сярэднявечча.

Але тое што змест адукацыі складаўся з навукова-рацыянальных дысцыплін, тым не менш не азначала магчымасць атрымання ведаў сапраўды навуковага (падобнага антычнаму) узроўню. Вучэбныя дысцыпліны да гэтых часоў, былі ўжо “ачышчаны” царкоўнымі ідэолагамі, ад “шкодных” для хрысціянства, антычных падыходаў. Гэта, адкрыта і недвухсэнсоўна падкрэсліваюць і самі аўтары аналізуемага даследавання: “*…граматыка, рыторыка (і паэзія) і дыялектыка… матэматычныя навукі, арыфметыка, геаметрыя, астраномія і музыка… (усе яны – В.П.) утвараюць гуманітарныя навукі…*”. Якія “*…служаць уводзінамі ў Багаслоўе, якому былі поўнасцю падпарадкаваны. Тэалогія была галоўнай мэтай трывіума і квадрыума, яна з'яўлялася іх мерай і важнейшым дасягненнем…*”. Усе заняткі, “*…былі звязаны з рэлігіяй, якая іх асвячала: мэта граматыкі заключалася ў тым каб лепей чытаць Святое Пісанне і больш дакладна яго перапісваць…*” (у сэнсе “размнажаць” ва ўмовах рукапіснай эры

трансляцыі (стварэння) літаратуры – В.П.); "*...рыторыка і дыялектыка (прызначаліся – В.П.) для больш дакладнага разумення твораў святых айцоў і эфектыўнага абвяржэння ерасі; музыка – гэта здольнасць больш прыгожа і меладычна спяваць царкоўныя песнапенні...*" (якія, як вядома, патрэбны для больш глыбокага ўздзеяння малітоўных працэсаў на прыхажан – В.П.) [9, p.102].

Цікавы сучасны погляд на адрозненне зместу выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў антычнасці і Сярэднявеччы даў загадчык гуманітарнай кафедры школы "Le Sallay Дыялог", каардынатар «Еўрапейскай гімназіі» (недзяржаўнай міжнароднай школы г. Масква, асацыяванай з ЮНЭСКА) Пётр Мазаеў [12]. Яго матэрыял дадзены ў складзе відэа ўрока, дзе матэрыял сфармуляваны выглядзе 18-ці асобных тэзісаў (гл. Даведку):

(Даведка: Гісторыя адукацыі. Сярэднія вякі: святыя тэксты і першыя ўніверсітэты:

(*аўтарскі тэкст тэзісаў дадзены ў перакладзе на бел. мову. Пераклад мой – В.П.*)

– Калі ў антычнай культуры ў цэнтры стаіць чалавек і яго пазнавальныя здольнасці, а сама культура – вусная (тэксты завучваюцца на памяць), то ў Сярэднія вякі ў цэнтры аказваецца святы тэкст;

– Малітоўнікі, псалтыры, Біблія становяцца важнымі кропкамі навучання і стадыямі адукацыі. Базавыя малітвы – гэта школа, псалтыр – універсітэт, Біблія – акадэмія. Нават захавалася прымаўка "*ты і псалтыры не прачытаў*". Яна азначае, што чалавек яшчэ не прыступіў да адукацыі;

– Пры гэтым сістэма трывіума і квадрывіума нікуды не знікае – проста зараз усё абапіраецца не толькі на антычных аўтараў;

– Калі ў цэнтры антычнасці стаяў чалавек і ідэя спаборніцтва, то сярэднявечная культура ставіць у цэнтр ідэю Бога і яго спазнання;

– Паступова ў сярэднявечным свеце пасля перыяду цёмных вякоў пачынае стварацца адзіная прастора. На Захадзе адукаваныя эліты ведаюць латынь, на Ўсходзе – латынь і грэцкі. Адукацыя звязана са святымі тэкстамі і пры гэтым – з антычнай паэзіяй таксама;

– Вялікую ролю адыгрываюць багаслоўскія школы і манастыры. Апошнія, становяцца цэнтрамі перадачы ведаў;

– На Ўсходзе, у Візантыйскай імперыі, працягваюць захоўвацца цэнтры адукаванасці, настаўнікі і граматыкі, якія прапануюць свае паслугі на вуліцах горада. Ступень адукаванасці там вышэйшая, чым на Захадзе;

- Калі на Ўсходзе ў 7–8 стст. усталёўваецца арабскае валадарства, арабы хутка асвойваюць антычную адукаванасць і пераводзяць усё на арабскую. У плане адукаванасці арабы амаль не адстаюць ад Візантыі – большасць людзей умеюць пісаць і чытаць;

– Асобным носьбітам ведаў становяцца юдэі. Іх рэлігія таксама як і іншыя аўраамічныя (хрысціянства і іслам) завязана на чытанні тэксту;

– Пры гэтым сярэднявечнае грамадства нават блізка не падыходзіць да той ступені адукаванасці, якая была ў антычную эпоху. Большасць людзей (нават шляхетных) павальна непісьменная;

– У сярэднявечную эпоху веды распаўсюджваюцца тымі ж спосабамі. Ёсць класы, прыватныя настаўнікі і настаўнікі царкоўныя ды манастырскія школы.

– Урэшце на Захадзе з'яўляецца аналаг акадэміі, якая існуе на Ўсходзе. Гэта ўніверсітэт – карпарацыя навукоўцаў і студэнтаў, якая дазваляе ім выйсці за межы саслоўных правілаў, якія існуюць у традыцыйным сярэднявечным свеце. Ён становіцца магутным спосабам перадачы ведаў;

– Універсітэт вырастае з манаскіх ордэнаў (многія – з жабрацкіх), якія ўзніклі ў пачатку XIII ст., напрыклад, францысканцаў і дамініканцаў;

– Адрозненне ад манастыроў папярэдняй эпохі ў тым, што паслядоўнікі новых ордэнаў чыталі пропаведзі ў горадзе, а не ў манастыры. Успомніце раман Умберта Эка "Імя Ружы". Яго героі-манахі замкнуты ў глушы. Манахі новых ордэнаў ідуць у горад, дзе пачынаюць прапаведаваць і засноўваць абшчыны. Да іх сцякаюцца людзі – так фармуюцца новыя цэнтры ведаў;

– Не выпадкова сучасныя ўніверсітэты прынялі ў спачыну гэтую манаскую ідэю. Успомніце Оксфард і Кембрыдж. У іх абедзенных залах стаяць тыя ж доўгія сталы і лавы;

– Адукаванасць распаўсюджваецца і пры двары. У XII–XV стст., пасля крыжовых паходаў, становіцца важна, каб пры двары быў адукаваны манах, летапісец ці паэт. З'яўляецца прыдворная паэзія, трубадуры і

мінезінгеры. Усе яны звязаны з універсітэцкім асяроддзем (*мінезінгеры – збіральны вобраз паэтаў і музыкантаў у Германіі* XII–XIII *стст., тое ж што і трубадуры у Францыі – В.П.*);

– Універсітэцкая адукацыя грунтуецца на антычных узорах і падтрымлівае ідэю, што трэба працаваць з тэкстамі. З'яўляюцца германеўтыка і экзегетыка – мастацтва тлумачэння тэкстаў. Паглыбляецца ідэя ўедлівага і шматслойнага аналізу тэксту, дыспутаў і лекцый, калі адзін чалавек сядзіць за кафедрай і вяшчае нешта людзям, якія сядзяць навокал;

– Фарміраванне ўніверсітэтаў на Захадзе, згасанне Візантыі як моцнага цэнтра і ўцёкі грэкаў, распаўсюджванне арабскай ісламскай пісьменнасці – усё гэта прыводзіць да таго, што прыблізна ў XIV–XV стст. у Еўропе пачынаецца Адраджэнне [12]. (*канец даведкі*).

Нямецкі погляд на заяўленую праблему ў другой палове XIX ст., выказаў гісторык Франц Антон Шпехт у манаграфіі: "*Гісторыя адукацыі ў Германіі: са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.*" [13], апублікаванай у 1885 г., у Штудгардзе. Ужо ў самым пачатку кнігі, на першай старонцы тэкста, аўтар акрэсліў ідэалагічныя "германскія" прыярытэты выкладання зместу. Разважаючы пра пачаткі інтэлектуальнай культуры ў Еўропе было заўважана, што "*...гнілое гіганцкае цела Рымскай імперыі рухнула пад ударамі наступаючых германскіх плямёнаў...*". А таксама, што: "*...дасягненні антычнай цывілізацыі на Захадзе ... дасталіся не жорсткім полчышчам варвараў, а багата адораным, маладым народам, успрымальным да ўплыву вышэйшай культуры. Знаходзячыся ў цесным кантакце з рымлянамі на працягу некаторага часу, германскія плямёны ... паважалі духоўную сілу і перавагу ворага, з якім яны змагаліся*" [13, s.1].

Што тычыць адносін да рымскай культуры і школ, то германцы, па сведчанні аўтара "*…пагадзіліся з установамі якія знайшлі ў заваяваных землях...*". Таму "*...рымская культура магла бяспечна існаваць усюды дзе германцы жылі разам з рымлянамі. Нават школы... у гарадах і паселішчах ... на самых аддаленых межах імперыі, не былі знішчаны рукамі германскіх плямёнаў.... Пачаткова, школьныя ўстановы яшчэ адтрымлівалі фінансавую дапамогу дзяржавы...*". І, паступова, прадстаўнікі дваранства Франкскай імперыі амаль паўсюдна "*...засвоілі звычай пасылаць сваіх дзяцей у навучанне*". А франкскі кароль Хільперык (гг.кір.: 561–584) "*...вельмі клапаціўся пра народную асвету... стварыў новыя літары... і разаслаў указы па ўсіх гарадах сваёй імперыі каб хлопчыкаў аддавалі ў навучанне...*" [13, s.2–3].

Праблема зместу выхавання і адукацыі знайшла адлюстраванне ў розных частках кнігі. Гаворачы пра "*палацавую школу*" (лац.: schola palatii; рус.: "дворцовая школа") пры "*...рэзідэнцыі гальскіх імператараў у Трыры...*" [13, s.4], аўтар успамінае звычай "прывядзення хлопчыкаў" з найзнатнейшых франкскіх сямей да кіраўніка дзяржавы "на выхавальніцтва". Пра які пісаў старажытнарымскі гісторык Тацыт (гг.ж.: сяр 50-х гг. – каля 120 г. н.э.), аўтар твора: "*Германія: аб паходжанні і месцапалажэнні германцаў*". Пра змест падрыхтоўкі ў названай школе заяўлена, што навучэнцы "*...маглі набываць тыя веды якія лічыліся неабходнымі для вядзення дзяржаўных спраў...*". Ім там прыходзілася "*...займацца дзелавым пісьменствам, складаць дакументы і падаваць іх каралю для выканання*" [13, s.4].

Адносна прысутнасці свецкіх навук у змесце навучання манастырскіх школ, заўважана, што "*...яны не толькі туды не ўваходзілі..., але нават лічыліся шкоднымі...*". Душа манаха павінна была імкнуцца "*...да дасканаласці адпавядання Госпаду...*" І таму, той "*...хто жадае пранікнуць у сутнасць Багаслоўя, не павінен марнаваць час на вывучэнне розных каментарыяў, а павінен накіраваць усе свае намаганні выключна на ачышчэнне сябе ад цялесных грахоў...*". І ў такім выпадку: "*...ён безумоўна зможа зразумець Святое Пісанне, нават без вывучэння тэалогіі...*" [13, s.41].

Што тычыцца зместу выхавання звычайнага насельніцтва, аўтар заўважыў: "*...рэлігійнае народнае навучанне пачыналася з катэхізічных урокаў, напрыклад выкладаліся Вялікія грахі, паводле Паслання да Галатаў, ... Адным з прадметаў пачатковага навучання было завучванне Псалтыра. Яшчэ да пачатку заняткаў навучання чытанню настаўнікі завучвалі на памяць паўтары сотні псалмоў, паўтараючы іх з дзецьмі, прызначанымі для духоўнай прафесіі... У ма-*

*настырскіх школах з асаблівай дбайнасцю выкладаліся ўрокі споведзі… (дзе вучылі – В.П.) шчырасці вызнання граху… (і давалі веды аб тым – В.П.) …як патрэбна, пасапраўднаму, каяцца ў грахах і шчыра выконваць споведзь (свяшчэнніку – В.П.)…*” [13, s.60].

(Даведка : “Пасланне да Галатаў”, адзін з лістоў (пісем) св. апостала Паўла, якое ўваходзіць у канон Новага Запавету. Пасланне з'яўляецца адным з самых старажытных сведчанняў хрысціянскай веры і мае вялікае значэнне для аднаўлення храналогіі жыцця апостала Паўла і эвалюцыі яго багаслоўскай думкі. “Галаты” – жыхары кельцкіх плямён, якія ўварваліся на Балканскі паўвостраў і ў Малую Азію ў 279–277 гг. да н.э., ды аселі там для пастаяннага пражывання). (*канец даведкі*)

Замежная гістарыяграфія XX ст., па заяўленай тэме прадстаўлена найперш буйнай працай: “*Гісторыя выхавання ў Антычнасці*” [14], французскага гісторыка-медыевіста, прафесара ф-та мастацтваў у Ліонскім ун-це (удзельніка фр. руху Супраціўлення) Анры-Ірэнэ Мару (фр.: *Henri-Irénée Marrou, гг.ж.: 1904–1977*). Кніга, апублікаваная ў 1948 г., і перакладзеная на шматлікія замежныя мовы, мае мэту (па словах аўтара), рэканструяваць адукацыйныя традыцыі класічнай антычнасці (грэчаскія і рымскія). Яна ахоплівае XIII вякоў гісторыі (ад Гамера, да т.зв.: “прэлюдыі Каралінгскага Адраджэння”), з 1000 г. да н.э. – да 500 г. н.э.

Пры такім падыходзе, як адзначыў доктар Юн Лі Ту, “запрошаны навуковы супрацоўнік Інстытута класічных даследаванняў” Лонданскага ўніверсітэта (Dr Yun Lee Too, Visiting Fellow, Institute of Classical Studies University of London): “*…у гэтай манументальнай абстаноўцы, узнікае мадэль грэчаскай адукацыі…*”. Ставіцца задача, найперш, паказаць уклад Грэцыі ў інтэлектуальную культуру Захаду. А таксама, станаўленне своеасаблівага тыпу педагогікі старажытных грэкаў, што пазней лёг у аснову заходнееўрапейскай культуры. Які “*…пачаў фарміравацца пасля перыяду класічнай Грэцыі…” (V–IV вв. да н.э. – В.П.) “…і атаясамліваецца аўтарам з перыядам Платона… (гг.ж.: каля 428–348 да н.э. – В.П.) ды Ісакрата (гг.ж.: 436–338 да н.э. – В.П.), гэта значыць у элiнiстычную эпоху (323–146 гг. – В.П.)*”. А “*…рэканструкцыя архаічнай і класічнай адукацыі…*” у кнізе, “*…з’яўляецца падрыхтоўчай працай каб паказаць станаўленне грэчаскага тыпу адукацыі…*”. Больш за тое, нават рымскі і хрысціянскі тып адукацыі ў манаграфіі А.-І. Мару разгледжаны адносна павярхоўна. Яго ўвага прыкавана да эліністычнай адукацыі. Гэта бачна нават на паказчыках колькасці тэксту: ”*… з больш чым 400 старонак, якія складаюць працу… і якія ахопліваюць паўтара тысячагоддзя, 171 прысвечана падзеям посткласічнага элінізаванага Егіпта… Для параўнання, адукацыя да Платона ды Ісакрата выкладзена на 94 старонках, Платону і Ісакрату, ці класічным Афінам, адведзена 42. Рымская адукацыя вывучаецца на 100 старонках, а хрысціянская – усяго на 38 …*” [15, p.41–49].

Кніга падзелена на 2 часткі: 1-я: “*Паходжанне класічнага выхавання (ад Гамера да Ісакрата)*” і 2-я: “*Карціна класічнага выхавання ў эліністычную эпоху*” [14]. Праблема зместу выхаваўча-адукацыйнага працэсу закранаецца аўтарам у розных главах манаграфіі і ў дачыненні да розных храналагічных перыядаў (*гэтаму мы плануем прысвяціць асобную публікацыю – В.П.*).

Важную крытычную заўвагу да манаграфіі А.-І. Мару, зрабіў вядомы французскі медыевіст, спецыяліст у галіне гісторыі школы, працу якога мы таксама будзем разглядаць (вучань А.-І. Мару), Пьер Рышэ. У адным з артыкулаў, прысвечаных гістарыяграфіі гісторыі школы (“*Разважанні пра гісторыю адукацыі ў раннім Сярэднявеччы V–XI стст.*” [16, p.24–25]), ён заўважыў, што: “*…Анры Мару сапраўды добра паказаў, што на Захадзе ў V ст., не існавала ніякай царкоўнай школы акрамя манастырскай, і што хрысціяне згаджаліся аддаваць сваіх дзяцей у антычную школу. Але я не згодзен з Мару там, дзе ён кажа, што царкоўная школа, біскупскага альбо прэсвітарскага тыпу, нарадзілася “з-за цяжкасцей тагачаснага перыяду”,* (інакш – В.П.) *каб замяніць старажытную школу якая перастала існаваць*”.

Маўляў, антычная школа знікла, а не вучыць дзяцей было нельга, і таму царква (з лепшых памкненняў) вырашыла арганізоўваць свае школы. Хоць мы ведаем, “*…што хрысціянскія школы і былі арганізаваны менавіта ў выглядзе рэакцыі на дзейнасць традыцыйных настаўнікаў…*”.

Царкоўнікі "*...былі супраць класічнай адукацыі, якая вучыла добра гаварыць, добра пісаць і была арыентавана на маладых людзей, якія жадаюць пазнаёміцца з сусветнай культурай і атрымаць пасады ў (дзяржаўным – В.П.) кіраванні. Больш за тое, яны не хацелі каб… (царкоўная ідэалогія, і – В.П.) …культура, прыналежалі толькі для меншасці (для нашчадкаў пануючых класаў – В.П.), яны хацелі каб з Бібліяй знаёмілася як мага большая колькасць людзей…*" [16, p.24–25]).

І гэта цалкам зразумела. Тут нельга не пагадзіцца з шаноўным Пьерам Рышэ. Царква ніколі не рабіла ніякіх "жэстаў добрай волі". Яна ажыццяўляла свае ўласныя мэты. Выконвала задачу хрысціянізацыі ўсяго (без выключэння), у дадзеным выпадку заходнееўрапейскага, соцыуму. Імкнулася зрабіць царкоўную дактрыну адзінай, пануючай ідэалогіяй грамадства. Прычым, менавіта, праз школьна-катэхізічнае царкоўнае выхаванне. А таму антычная школа, якая мела задачу даць навукова-рацыянальныя веды, навучыць "*добра гаварыць, добра пісаць*" і стварыць магчымасць для атрымання пасадаў у дзяржаўным кіраванні, была для яе прамым канкурэнтам. І зразумела, падлягала адназначнаму знішчэнню.

Адной з найбольш грунтоўных прац другой паловы XX ст., з'уляецца манаграфія вядомага французскага медыевіста, П'ера Рышэ (гг. ж.: 1921–2019), доктара навук, які на працягу 22 гадоў (1967–1989) працаваў прафесарам у адным з 13 незалежных універсітэтаў Сарбоны – "Парыж X - Нантэр": "*Школы і навучанне ў Высокім Сярэднявеччы*" (1979) [17]. У манаграфіі падрабязна прааналізавана выхаваўча-адукацыйная справа "*…на хрысціянскім Захадзе з канца V да сярэдзіны XI ст.*". Аўтар шырока, пераканаўча і абгрунтавана паказаў эвалюцыю сацыялізацыі падрастаючых пакаленняў у названы храналагічны перыяд з прывязкай да сацыяльна-палітычных і агульнакультурных працэсаў. Кніга (памерам у 463 стар.), падзелена на ўводзіны і чатыры буйныя раздзелы. Агульнага заключэння аўтар не рабіў. Асобныя высновы падведзены ў некаторых раздзелах паасобку.

Калі коратка, то кніга П. Рышэ складаецца з наступных важных канцэнтраў (*больш падрабязны аналіз названай манаграфіі плануецца даць у асобных публікацыях – В.П.*). Ва ўводзінах, спецыяльна паказаны асаблівасці пераходу ад антычнасці да Сярэднявечча. Першы раздзел асноўнага тэксту кнігі аўтар назваў: "*Школы падчас Каралінскага адраджэння (VIII–IX стст.)*" і падзяліў яе на пяць глаў (*chapitre*). Другі раздзел кнігі названы: "*Уздым ("essor" – В.П.) заходніх школ (сярэдзіна X-га – сярэдзіна XI-га стст.)*", і падзелены аўтарам на тры главы. Трэці раздзел "*Сродкі і метады набыцця ведаў*", падзелены на чатыры главы. Чацвёрты (апошні) раздзел кнігі: "*Адукацыя і культура свецкіх*", падзелены на дзве буйныя главы. Першая яго глава, "*Адукацыя і культура арыстакратаў*" пачынаецца з характарыстыкі такога, даволі інфарматыўнага (для даследавання выхаваўча-адукацыйнай практыкі) віду літаратурнай творчасці эпохі Сярэднявечча як "*зерцала*". Другая глава чацвёртага раздзела "*Настаўленне хрысціянскага народу*" складаецца ажно з сямі частак. Такіх як: "*Умовы рэлігійнага навучання*"; "*Хрысціянская ініцыяцыя*"; "*Рэлігійнае выхаванне праз пропаведзь*"; "*Рэлігійнае навучанне праз вобразы*"; "*Папулярныя песні*"; "*Хрысціянскія заклінанні*"; "*Ацэнка народнага душпастырства*". Завяршаючы апошні раздзел кнігі аўтар зрабіў заключэнне: "*Новыя ўмовы інтэлектуальнага жыцця ў сярэдзіне IX ст.*".

Змест (кантэнт) адукацыі ды выхавання бачны ў тэксце кнігі ў розных месцах. Так напрыклад, завяршаючы размову пра "*характарыстыку класічнай культуры ў VI–VII стст.*" аўтар заўважыў, што ў названы перыяд, ішло паступовае адміранне і звужэнне класічнай адукаванасці. Яна перастала быць паўсюдна з'явай, і паступова захавалася толькі ў вузкіх арыстакратычных колах. Страціла былую шырыню навуковых напрамкаў эпохі антычнасці. "*Абмежаваная толькі граматыкай, рыторыкай і эрудыцыяй класічная культура збяднела. Яе знясіленне яшчэ больш узмацнілася забыццём грэчаскай мовы і філасофіі*". І далей, "*… тое што засталося (у адукаванасці грамадства – В.П.) ад класічнай культуры ў VI–VII стст., было нездольнае ствараць свае, арыгінальныя творы…*". А працэс ішоў яшчэ далей, "*…арыстакратыя паступова губляла свой прэстыж і палітычную ролю, калі яна злівалася з германскімі элементамі ..*". І ў гэтых

умовах "… *класічная культура была б асуджана на пагібель, калі б хрысціянскія літаратары не паспрабавалі выкарыстаць яе для развіцця сваёй рэлігійнай культуры.*" [17 p.26–27].

Такім чынам аўтар, як бы не толькі не паказвае царкоўна-хрысціянскае асяроддзе ў якасці далакопа (*рус*.: "могильщика") класічнай культуры, але нават выстаўляе яго, яе ратавальнікам, з чым мы не можам пагадзіцца. Далей – болей. Пры выкладанні пытання: "*Класічная пісьмовасць на службе хрысціянскай культуры*", для адлюстравання жадаемых межаў (зместу) адукаванасці царкоўнага дзеяча высокага ўзроўню, прыведзена цытата з дакумента (De doctrina christiana): "*…хрысціянскі інтэлектуал павінен быў мець добрую граматычную адукацыю, ведаць лацінскую і грэцкую мовы, і нават іўрыт, ведаць правілы рыторыкі і дыялектыкі, мець некаторыя ўяўленні аб натуральных навуках: арыфметыцы, гісторыі, геаграфіі, ды інш.*" [17 p.27].

Інакш, па меркаванні шаноўнага прафесара (а цытаваны дакумент, як вядома, быў распрацаваны адным з відных тэарэтыкаў хрысціянства, блажэнным Аўгустынам Аўрэліем: гг.ж.: 354–430) атрымліваецца, што царкоўныя ідэолагі выступалі за тое каб будучыя святары мелі магчымасць набыць адукацыю навуковага ўзроўню (уключаючы антычныя навукі).

У ідэале гэта канешне гучыць нядрэнна. Сапраўды, блаж. Аўгустын у сваіх працах неаднаразова падкрэсліваў неабходнасць валодання шэрагам антычных навук. Але, разам з тым, у яго тэкстах (напрыклад у працы "*Хрысціянская навука, альбо Асновы Герменеўтыкі…*"), рабіліся важныя агаворкі пра тое, што: "*….юнакам, прыхільным да навук, …, якія маюць страх Божы і жадаюць Блажэннага жыцця, вельмі карысна, … прапанаваць наступнае настаўленне: не павінна без спецыяльнай верыфікацыі захапляцца ніякім вучэннем, якое выкладаецца па-за царквой Хрыстовай…*". Любыя навукі павінны строга верыфікавацца на адпаведнасць царкоўным ідэалам, і калі яны не адпавядаюць ім, "*…то ўсе такія навукі павінны быць адкінуты … без міласэрнасці…*" [18, кн.2., п.58]. Іншымі словамі, блаж. Аугустын сапраўды выступаў за навучанне святароў традыцыйным (вядомым з антычнасці) дысцыплінам, але у тым выглядзе калі яны ўжо пройдуць так зв.: ідэалагічнае "ачышчэнне" царквой. Тым, пра якія гісторык Ф. Гізо заўважыў: "*...не столькі навучалі, сколькі прывязвалі да Багаслоўя…"* [7, р.4-5].

З гэтым у рэшце пагадзіўся і П. Рышэ. Каб ярчэй праілюстраваць адказ пытанне: "Як царква адносіцца да антычнай адукаванасці?", ён прывёў вытрымку з яўрэйскай Бібліі (Торы) дзе даецца ўказанне ізраільскаму хрысціянскаму воіну, які раптам захоча ажаніцца на прыгожай прадстаўніцы паганскага веравызнання. У такім выпадку ён павінен: "*...пастрыгчы ёй валасы і абрэзаць пазногці…*", а потым можна і ажаніцца [19]. Гэтаксама, па меркаванні айцоў царквы, падкрэсліў аўтар, хрысціянам патрэбна адносіцца і да антычнай навукі і адукацыі… Патрэбна "ачысціць" яе ад таго што "непатрэбнае" (альбо "шкоднае") для хрысціянскай ідэалогіі…, а астатняе можна выкарыстоўваць для навучання і выхавання хрысціянскіх вернікаў.

Завяршаючы другі раздзел кнігі (у канцы трэцяй яго главы: "*Гарадскія школы*"), аўтар падкрэсліў, што ў X–XII стст. сапраўды ў Заходняй Еўропе быў уздым культуры. Які выразна выявіўся ў вяртанні да антычнай культуры і адукаванасці. "*Даследаванне якое мы …правялі ў манастырскіх і гарадскіх цэнтрах X і XII стст .. легітымізуе выраз "рэнесанс", які мы выкарысталі ў пачатку раздзела. Клірыкі і манахі гэтага перыяду аднавілі сувязь з культурай позняй Антычнасці. Яны вяртаюцца да вывучэння логікі і матэматычных навук. Іх зноў цікавіць рымскае права. ...яны больш свабодна чым у IX ст., прысвячаюць сябе чытанню антычных аўтараў… . У (многіх – В.П.) бібліятэках … кнігі свецкіх аўтараў, перавышаюць колькасць сакральных. Для шэрагу навукоўцаў свецкія дысцыпліны маюць аўтаномнае значэнне, незалежнае ад рэлігійных даследаванняў… У выніку, прыгожы Каралінгскі сінтэз (навукова-рацыянальнага і царкоўна-ідэалагічнага – В.П.) які заснаваў хрысціянскую навуку, зрушаны. У параўнанні з надзвычайнай цікавасцю да свецкага мастацтва, святая навука значна бляднее. У нас няма значных багаслоўскіх трактатаў якія б былі напісаны ў X ст. Рэлігійная літаратура гэтага перыяду абмяжоўваецца толькі пропаведзямі, жыццямі святых і маральнымі*

*творамі... Нават калі паглыбіцца ў народную літаратуру (гэтага перыяду – В.П.) то відно, што абмен паміж лацінскай і нелацінскай культурай адбываўся часцей чым раней"* [17 p.185–186].

Найбольш падрабязна відаць, аўтар гаворыць пра змест адукацыі ў трэцім раздзеле кнігі (у гл.: 2: "*Пачатковая і спецыяльная адукацыя*"). Тут, пасля высвятлення асаблівасцей мэблі і розных прыстасаванняў што выкарыстоўваліся пры навучанні названы чатыры накірункі зместу адукацыі якія меліся ў пачатковай школе: "*чытанне*", "*пісьмо*", "*спевы*", "*лічэнне*", "*латынь*". Распавядаючы, напрыклад, пра чытанне аўтар расказвае што спачатку сямігадовае дзіця вучыла літары алфавіту (*элементы літар, сімвалы, альбо выявы літар*). Потым склады з літар. А на трэцім этапе – словы і сказы. Паўсюдна, у якасці першага тэкста для чытання, выкарыстоўваўся псалтыр. З гэтай кнігай у Сярэднявеччы ўзнікла нават некалькі прымавак: "*быць псалтырам*" – значыць умець чытаць; альбо размоўная: "*ты нават псалтыры не прачытаў*" – гэта значыць: "ты не адукаваны", "ты нават не прыступаў да адукацыі".

(Даведка: Псалтыр (*рус*.: Псалтирь): адна з самых старажытных богаслужэбных кніг Святога Пісання, якая ўваходзіць у склад Бібліі. Яна ўключае 150 псалмоў (песень). Па сутнасці гэта малітвы, запісаныя мовай паэзіі. У хрысціянскай Бібліі Псалтыр размяшчаецца пасля Кнігі Іова і перад Кнігай Прытчаў Саламонавых. Псалтыр, займае другое месца пасля Евангелля. Гэта таксама і богаслужбовая кніга. Псалмы ўваходзяць у склад любога малітоўнага царкоўнага паследавання. Тэкст псалтыра чытаюць, альбо спяваюць, а ў старажытнасці нават з выкарыстаннем музычных інструментаў. (*канец даведкі*)

Заключэнне. Такім чынам змест адукацыі ды выхавання пры пераходзе ад антычнасці да Сярэднявечча, у параўнаўчым (грамадазнаўчым) кантэксце, яшчэ не быў прадметам асобнага гістарыяграфічнага даследавання. Разам з тым, сегменты тэмы паасобку знайшлі адлюстраванне на старонках шматлікіх даследаванняў у айчыннай і замежнай літаратуры.

З прыведзенага гістарыяграфічнага матэрыялу відно, што праблематыка прысвечаная кантэнту адукацыі, альбо тым кампетэнцыям якія надаваліся моладзі на пераломным этапе ад антычнасці да Сярэднявечча, цікавіла гісторыкаў з розных краін, і ў розныя гістарычныя эпохі.

Гістарычных даследаванняў, якія б былі прысвечаны разгляду выключна толькі зместу (кантэнту) выхавання і адукацыі, нам знайсці не ўдалося. А сама праблема зместу закраналася і даволі шырока ў працах па гісторыі школы. На чым канкрэтна (гаворачы пра змест), засяроджвалі сваю ўвагу даследчыкі, відно з вышэй прыведзенага матэрыялу. Больш падрабязны аналіз некаторых (найбольш інфарматыўных) прац, што прыведзены ў дадзеным аглядзе, мы паспрабуем зрабіць пазней.

**Спіс літаратуры**

1. Пілецкі, В. А. Пра адрозненне антычнай і сярэднявечнай адукаванасці / В. А. Пілецкі // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2024. – Т.69, №1. – С.25 – 35.
2. Леднев, В. С. Содержание образования: сущность, структура, перспективы: научное издание / В. С. Леднев. – 2-е перераб. изд. – М. : Высш. шк., 1991. – 223 с.
3. Бабинский, М. Б. Теория образовательного процесса / М. Б. Бабинский. – М.: «Физматкнига». 2010 – 368 с.
4. Ситаров, В. А. Содержание образования эпохи раннего Средневековья / В. А. Ситаров // Теория обучения. Теория и практика : учебник для бакалавров / В. А. Ситаров. – Москва : Издательство Юрайт, 2021. – 447 с.
5. Litak, S. Historia wychowania do Wielkiej rewolucji Francuskiej / Stanistaw Litak / wydanie drugie, poprawione i uzupelnione. – Kraków: Wydawnictwo WAM wsf-p "IGNATIANUM", 2005. – 256 s.
6. Пілецкі, В. А. Французская гістарыяграфія першай паловы XIX ст. пра змест выхавання і адукацыі ў антычнасці ды Сярэднявеччы / В. А. Пілецкі // «Интернаука»: научный журнал – № 17(334). Часть 6. – М., Изд.: «Интернаука», 2024. – 56 с. С. 47–54.
7. Histoire de la civilisation en France, depuis la chute de l'Empire Romain, par м. Guizot. Nouvelle edition. V.2. Paris: Didier, Libraire-Éditeur, 1846. – 408 p.

8. Viriville, V. L'instruction publique en Europe et principalement en Franse depuis le creistianisme jusqu'a nos jours. Universités, colléges ecoles des deux sexes, académies, bibliothèques publiques, etc. / Vallet de Viriville. / Illustration archeologiques executeas sous la direction de Ferdinand Seré, directore artistique du grande ouvrage «Moyen age et la Renaissance». Paris: Administration du Moyen age et la Renaissance, 1848. – 400 p.
9. De l'Instruction publique au Moyen age (VIII au XVI siecle), par Charles Stallaert, et Philippe van der Haeghen (Couronné par l'Académie royale de Belgique, le 8 mai 1850). 2-ed. Bruxelles: Imprimerie de Ch. Lelong, 1853. – 441 p.
10. Список Советов Ахена // [Электронный ресурс]. – 2024. – URL.: па: https://fr.wikipedia.org/wiki/Liste_des_conciles_d%27Aix-la-Chapelle. (дата обращения: 08.04.2024).
11. Алексин, К. В. Пастырское попечение как дисциплина и направление подготовки / К. В. Алексин // [сайт]. – 2024. – URL.: https://cyberleninka.ru/article/n/pastyrskoe-popechenie-kak-distsiplina-i-napravlenie-podgotovki/viewer. (дата обращения: 10.04.2024).
12. История образования. Средние века: священные тексты и первые университеты // [сайт]. – 2023. – URL.: https://levelvan.ru/pcontent/obrazovanie-9/srednie-veka. (дата обращения: 28.03.2024).
13. Specht, F.A. Geschichte Des Unterrichtwesens in Deutschland: Von Den Altesten Zeiten Bis Zur Mitte Des Dreizehnten Jahrhunderts / von Franz Anton Specht. – Stuttgart: Verlag der J.G. Cotta'schen Buchhandlung. 1885. – 411 s.
14. Marrou, H.-I. Histoire de l'éducation dans l'antiquité / H.-I. Marrou. – Paris: ed. Revue et augmentee, 1965. – 425 p.; (Марру, А.-И. История воспитания в античности (Греция) / А.-И. Марру / пер. с фр. А.И. Любжина, М.А. Сокольской, А.В. Похомовой; ред. А.И.Любжин. – М.: «Греко-латинский кабинет» Ю.А. Шичалина, 1998. – 425 с.
15. Yun Lee Too, A. New History of Education in Antiquity / traduction en français de Jean-Marie Paille: L'Histoire de l'éducation dans l'antiquité et l'historiographie contemporaine. – 2024. – URL.: https://books.openedition.org/pumi/10362. (дата обращения: 10.05.2024).
16. Riché, P. Réflexions sur l'histoire de l'éducation dans le Haut Moyen Âge (Ve-XIe siècles) / Pierre Riche. – 2024. – URL.: https://www.persee.fr/doc/hedu_0221-6280_1991_num_50_1_2492. (date d'accès: 03.04.2024).
17. Riche, P. Écoles et enseignement dans le Haut Moyen Age / Pierre Riche / Les écoles et l'enseignement dans l'Occident chrétien de la fin du V siecle au milieu du XI siècle. Collection historique dirigée par Paul Lemerle et Maurice Agulhon). Paris: Aubier Montaigne, 1979. – 463 p.
18. Августин, А. Христианская наука или Основания Герменевтики и Церковного красноречия /Аврелий Августин. – 2024. – URL.: https://azbyka.ru/otechnik/Avrelij_Avgustin/hristianskaja-nauka-ili-osnovanija-germenevtiki-i-tserkovnogo-krasnorechija/#sel=152:247,152:247. (дата обращения: 19.03.2024).
19. Второзаконие 21. Современная Тора: 12-14. – 2023. – URL.: https://bible.by/erv/5/21/. (дата обращения: 27.03.2024).

**References**

1. Pilecki V.A. Pra adroznenne antychnaj i syarednyavechnaj adukavanasci [On the difference between ancient and medieval education]. *Vesczi` Naczy`yanal`naj akade`mi`i` navuk Belarusi`. Sery`ya gumani`tarny`kh navuk* [Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanities Series]. 2024, vol. 69, no. 1, pp.25 – 35. (In Russian)
2. Lednev V.S. *Soderzhanie obrazovaniya: sushchnost', struktura, perspektivy* [Contents of education: essence, structure, prospects]. Moscow, 1991, 223 p. (In Russian)
3. Babinskij M.B. *Teoriya obrazovatel'nogo processa* [Theory of the educational process]. Moscow, «Fizmatkniga». 2010, 368 p. (In Russian)
4. Sitarov V.A. Soderzhanie obrazovaniya epohi rannego Srednevekov'ya [The content of education in the early Middle Ages]. *Teoriya obucheniya. Teoriya i praktika* [heory of

learning. Theory and practice]. Moscow, Izdatel'stvo YUrajt, 2021, 447 p. (In Russian)
5. Litak S. Historia wychowania do Wielkiej rewolucji Francuskiej. wydanie drugie, poprawione i uzupelnione Kraków, Wydawnictwo WAM wsf-p "IGNATIANUM", 2005, 256 p.
6. Pilecki V.A. Francuzskaya gistaryyagrafiya pershaj palovy XIX st. pra zmest vyhavannya i adukacyi ў antychnasci dy Syarednyavechchy [French historiography of the first half of the 19th century on the content of upbringing and education in antiquity and the Middle Ages]. *«Internauka»: nauchnyj zhurnal* [Internauka": scientific journal]. CHast' 6. Moscow, «Internauka», 2024, no. 17(334), pp. 47–54. (In Russian)
7. Histoire de la civilisation en France, depuis la chute de l'Empire Romain, par m. Guizot. Nouvelle edition. V.2. Paris, Didier, Libraire-Éditeur, 1846, 408 r.
8. Viriville V. L'instruction publique en Europe et principalement en Franse depuis le creistianisme jusqu'a nos jours. Universités, colléges ecoles des deux sexes, académies, bibliothèques publiques, etc. Illustration archeologiques executeas sous la direction de Ferdinand Seré, directore artistique du grande ouvrage «Moyen age et la Renaissance». Paris: Administration du Moyen age et la Renaissance, 1848, 400 r.
9. De l'Instruction publique au Moyen age (VIII au XVI siecle), par Charles Stallaert, et Philippe van der Haeghen (Couronné par l'Académie royale de Belgique, le 8 mai 1850). 2-ed. Bruxelles: Imprimerie de Ch. Lelong, 1853, 441 p.
10. *Spisok Sovetov Ahena* [List of Aachen Councils]. 2024. (In Russian). Available at: https://fr.wikipedia.org/wiki/Liste_des_conciles_d%27Aix-la-Chapelle. (accessed: 08.04.2024).
11. Aleksin K.V. *Pastyrskoe popechenie kak disciplina i napravlenie podgotovki* [Pastoral care as a discipline and direction of training]. (In Russian). 2024. Available at: https://cyberleninka.ru/article/n/pastyrskoe-popechenie-kak-distsiplina-i-napravlenie-podgotovki/viewer. (accessed: 10.04.2024).
12. *Istoriya obrazovaniya. Srednie veka: svyashchennye teksty i pervye universitety* [History of Education. Middle Ages: Sacred Texts and the First Universities]. (In Russian). 2023. Available at: https://levelvan.ru/pcontent/obrazovanie-9/srednie-veka. (accessed: 28.03.2024).
13. Specht F.A. Geschichte Des Unterrichtwesens in Deutschland: Von Den Altesten Zeiten Bis Zur Mitte Des Dreizehnten Jahrhunderts. Stuttgart, Verlag der J.G. Cotta'schen Buchhandlung. 1885, 411 p.
14. Marrou H.-I. Histoire de l'éducation dans l'antiquité. Paris. Ed. Revue et augmentee, 1965, 425 r.
15. Yun Lee Too A. New History of Education in Antiquity, traduction en français de Jean-Marie Paille: L'Histoire de l'éducation dans l'antiquité et l'historiographie contemporaine. 2024. Available at: https://books.openedition.org/pumi/10362. (accessed: 10.05.2024).
16. Riché P. Réflexions sur l'histoire de l'éducation dans le Haut Moyen Âge (Ve-XIe siècles). 2024. Available at: https://www.persee.fr/doc/hedu_0221-6280_1991_num_50_1_2492. (accessed: 03.04.2024).
17. Riche P. Écoles et enseignement dans le Haut Moyen Age. Les écoles et l'enseignement dans l'Occident chrétien de la fin du V siecle au milieu du XI siècle. Collection historique dirigée par Paul Lemerle et Maurice Agulhon). Paris: Aubier Montaigne, 1979, 463 r.
18. Avgustin A. *Hristianskaya nauka ili Osnovaniya Germenevtiki i Cerkovnogo krasnorechiya* [Christian Science or the Foundations of Hermeneutics and Ecclesiastical Eloquence]. (In Russian). 2024. Available at: https://azbyka.ru/otechnik/Avrelij_Avgustin/hristianskaja-nauka-ili-osnovanija-germenevtiki-i-tserkovnogo-krasnorechija/#sel=152:247,152:247. (accessed: 19.03.2024).
19. *Vtorozakonie 21. Sovremennaya Tora: 12-14* [Deuteronomy 21. Modern Torah: 12-14.]. (In Russian). 2023. Available at: https: //bible.by/erv/5/21/.(accessed: 27.03.2024).

*Received 15 October 2024*